# «ЧАЛАВЕК ПАВІНЕН СПЯВАЦЬ!»





Мая дарога ў школу ў гарадскім пасёлку Краснаполле на Магілёўшчыне ішла паўз стары будынак, дзе вісела чырвоная шыльдачка з надпісам «Дабрыня». Цяпер, калі школа ўжо ў іншым месцы, а я іду кароткай сцежкай на мясцовы рынак, — праходжу міма дома, дзе знаходзіцца народны клуб ветэранаў, — змянілася месца дыслакацыі, але не назва. Адтуль на ўсё наваколле даносяцца гукі гармоніка і бойкія галасы. «Чалавек павінен спяваць — тады і хварэць не будзе», — з усмешкамі кажуць удзельнікі клуба.

Таццяна ТКАЧОВА, фота аўтара.





